Зазвычай, калі мы кажам слова **Пасха**, у большасці вернікаў гэтае слова асацыіруецца з **Вялікаднем**, то бок з самой **Светлай Урачыстасцю Хрыстовага Уваскрэсення**. Аднак слова Пасха паходзіць ад габрэйскага слова Пасах (פסח), што значыць “мінаванне”, “праходжанне”.

**У** Старым Запавеце Пасха была святам вызвалення Божага Народу з Егіпта, з дому рабства, а ў Новым – вызвалення з валадарства граху і смерці праз смерць і ўваскрэсенне Госпада Нашага Ісуса Хрыста. Гаркота пакутаў смерці і радасць уваскрасення неаддзельныя адно ад аднаго. Таму, як раней Народ Божы еў пасхальнае ягня з горкімі зёлкамі, якія нагадвалі пра рабства егіпецкае, так і зараз Святая Праваслаўная Царква ўспамінае як дні пакуты Госпада (**Пасха Крыжа**, **Страсны тыдзень**), так і Яго уваскрэсенне (**Вялікдзень**, **Светлы тыдзень**).

**У**спамін **Пасхі Крыжа** пачынаецца ў **Лазараву Суботу**. Гэты дзень ужо не адносіцца да святой чатырохдзесятніцы **Вялікага посту**, хаця пост яшчэ не адпускаецца.

## Лазарава Субота

**У** Лазараву Суботу ўзгадваецца уваскрашэнне Лазара – сябра Хрыста. Гэтае дзеянне было зроблена, калі Лазар прабыў ужо чатыры дні ў магіле. Такім чынам Гасподзь Ісус на вачах усяго народу паказаў апошнюю з трох найважнейшых прыкметаў Месіі, вядомых юдэйскаму паданню, – ацаліць народжанага сляпым, выгнаць глуханямога шатана і ўваскрасіць памерлага.

**У**васкрашэнне Лазара стала тым паваротным момантам, калі Божы Народ пачаў канчаткова дзяліцца на тых, хто вызнае Ісуса Месіяй і хто гэтаму супраціўляецца.

## Уваход Гасподні ў Ерусалім

**С**вята Уваходу Госпада ў Ерусалім (**Вербная нядзеля** ці **Нядзеля вай**), працягвае ўзгаданне крыжовых пакут Хрыста. Асліца і малады асёл, як было прадказана ў прарокаў, уводзяць Госпада ў Ерусалім – насустрач Ягонаму выбару. Ісус уваходзіць у сталіцу як валадар, але валадар рахманы і мірны. Тое, што цар едзе ў горад на асле, успрымалася як знак міру, як знак таго, што горад не будзе знішчаны (у адрозненне ад уезду на калясніцы). У гэты дзень і мы, як бы прысутнічаючы там, вітаем Хрыста галінкамі вербаў і вызнаем Яго сваім Валадаром і Госпадам.

## Вялікі Панядзелак

**У** панядзелак Страснoй сядзьміцы прыпамінаецца стара-запаветная гісторыя пра продаж Язэпа братамі ў Егіпет як праобраз Распяцця Хрыста, а таксама гісторыя са смакоўніцай, на якой Гасподзь Ісус не знайшоў плода. У гэты дзень вернікі ўзгадваюць аб тым, што смерць Хрыста адбылася па нашых правінах і моляць Госпада аб тым, каб прынесці належны плод пакаяння і не аказацца не гатовымі ў дзень прыходу Хрыстовага.

## Вялікі Аўторак

**У** аўторак Страснoй сядзьміцы ў царкве ўзгадваюцца тыя строгія выкрыванні, што прамовіў Ісус у адносінах да кніжнікаў і фарысеяў, а таксама прыпавесці і настаўленні, прамоўленыя ў храме, – аб падатках кесару, аб Страшным судзе, прыпавесць аб талентах і аб дзесяці дзевах. У гэты дзень і кожны з нас атрымлівае строгія, але пры гэтым практычныя і выканальныя настаўленні Госпада Ісуса аб тым, як трэба сябе паводзіць і пра што клапаціцца, каб стацца спадкаемцам Божага Валадарства.

## Вялікая Серада

У сераду Страсной сядзьміцы ўзгадваецца здрада Юды, а таксама ўчынак жанчыны, якая памазала ногі Хрыста каштоўным мірам. Гэтыя гісторыі паказваюць нам гісторыю чалавека, які спакусіўся дабротамі гэтага свету і чалавека, які нічога не пашкадаваў дзеля Хрыста.

## Вялікі Чацвер

У гэты дзень узгадваецца Таемная вячэра Хрыста і Яговых вучняў. Служыцца літургія Васіля Вялікага.

## Вялікая Пятніца

Узгадваюцца Крыжовыя пакуты і смерць Хрыста. За ютранню (служба адбываецца ў чацвер увечары) чытаюцца 12 урыўкаў з евангелляў з распаведам пра гэтыя падзеі. Удзень адбываецца вынас Плашчаніцы – іконы Хрыста, які ляжыць у магіле. Плашчаніцу выносяць з алтара ў цэнтр храма і кладуць у «магілу» – узвышша, упрыгожанае кветкамі.

## Вялікая Субота

У гэты дзень узгадваецца перабыванне Хрыста ў магіле. Здзяйсняецца літургія Васіля Вялікага разам з вячэрняй. Спевы ў памяць пахавання Ісуса Хрыста злучаюцца са спевамі Уваскрэсення. Да часу чытання Евангелля, якое абвяшчае пра ўваскрэсенне Збавіцеля (Мц. 28: 1-20), усё – святары, Прастол, ахвярнік і аналой пераапранаецца ў светлае.

З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода протаіерэя Ігара Галакава
*Падрыхтаваў Алесь Спіцын*
Дата выпуску: 24 красавіка 2015 г.



# Міхайлаўскі лісток

Красавік, 2016
Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2

## Пасха Крыжа

## Уваход Гасподні ў Іерусалім

